*УДК 94:327(43+4-11)"1925"*

**М.М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны

# ЗМЕНЫ Ў МІЖНАРОДНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ЦЭНТРАЛЬНА-УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў СУВЯЗІ З ПАДРЫХТОЎКАЙ РЭЙНСКАГА ГАРАНТЫЙНАГА ПАКТА

*У артыкуле разгледжана міжнародная сітуацыя, якая склалася ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе ва ўмовах падрыхтоўкі Рэйнскага гарантыйнага пакта. Выяўлены ўплыў, які гэты працэс аказаў на знешнюю палітыку СССР, Германіі і Польшчы, адносіны паміж імі.*

У пачатку 1925 г. Германія звярнулася да Францыі і Вялікабрытаніі з прапановай заключыць пакт, які б гарантаваў германа-французскую і германа-бельгійскую граніцы, ўсталяваныя Версальскім дагаворам. Падпісанне такога пагаднення з'явілася б важнай вехай на шляху збліжэння Германіі з краінамі Захаду. Праектуемы пакт закранаў інтарэсы краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Адных, такіх як Польшча і Чэхаславакія, таму, што яны мелі агульную граніцу з Германіяй. Але ў той час памкненні Германіі да рэвізіі граніцы з Чэхаславакіяй практычна не прасочваліся, таму Прага спакойна рэагавала на падрыхтоўку Гарантыйнага пакта, і яе дыпламатыя не праявіла актыўнасці па гэтаму пытанню. Іншая справа Польшча. З моманту заключэння Версальскага дагавора Германія не хавала планаў пры спрыяльных умовах дабіцца перагляду ўсталяванай ім польска-германскай граніцы. Сярод дзяржаў рэгіёна, чые інтарэсы закранаў будучы пакт, быў і Савецкі Саюз. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што ён даваў новы штуршок збліжэнню Германіі з Захадам, што не магло не паўплываць на рапальскі курс у савецка-германскіх адносінах. У дадзеным артыкуле мы зробім спробу ўстанавіць, як працэс падрыхтоўкі Рэйнскага гарантыйнага пакта ўплываў на сітуацыю ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе і палітыку вядучых дзяржаў гэтага рэгіёна.

Пры ацэнцы будачага дагавора выявілася супаддзенне пазіцый ўрадаў СССР і Польшчы, якія бачылі ў ім фактар, што прывядзе да пагаршэння міжнароднага становішча абедзвюх краін. Савецкае кіраўніцтва пры ацэнцы праектуемага Гарантыйнага пакта зыходзіла з таго, што ён уяўляе сабою спробу, перш за ўсё з боку Англіі, стварыць адзіны антысавецкі фронт еўрапейскіх капіталістычных дзяржаў з удзелам у ім Германіі. Германскі пасол у



Маскве У. Брокдорф-Ранцау паведамляў у Берлін, што перамовы аб Гарантыйным пакце адмоўна ўплываюць на савецка-германскія адносіны [1, с. 127].

Заклапочанасць польскага ўрада была выклікана ў першую чаргу тым, што ў прапанаваным Берлінам праекце Гараныйнага пакта адсутнічала ўпамінанне пра ўсходнія граніцы Германіі. Міністр замежных спраў Польшчы А. Скшыньскі ў сваім дакладзе аб міжнародным становішчы Польшчы ў студзені 1925 г. указаў на імкненне Вялікабрытаніі адарваць Германію ад СССР і далучыць яе да антысавецкай кааліцыі. Для гэтага Германія павінна атрымаць істотныя кампенсацыі. Прадаставіць іх брытанскі ўрад паспрабуе за кошт Польшчы ў выглядзе саступкі Германіі Верхняй Сілезіі і Паморья. Пры гэтым, па словах А. Скшыньскага, Вялікабрытанія выдатна разумеее, што нават пад пагрозай страты Сілезіі і Памераніі Польшча не пойдзе на саюз з СССР [2, л. 38]. У час выступлення ў сеймавай камісіі па замежных справах 26 лютага ён адзначыў, што Польшча не падпіша Гарантыйнага пакта, калі ў ім не будуць гарантаваны ўсходнія граніцы Германіі [3, s. 289–292]. У Маскве ведалі пра негатыўнае стаўленне Варшавы да германскай ініцыятывы. Паўпрад у Варшаве П. Войкаў у пасланні ў Маскву ад 18 лютага адзначаў крайнюю заклапочанасць А. Скшыньскага ў сувязі з перамовамі аб Гарантыйным пакце [2, л. 51].

З пачаткам перамоў аб Гарантыйным пакце палітыка СССР, Польшчы і Германіі, іх адносіны паміж сабою будуць у вялікай ступені вызначацца гэтым фактарам. Польская дыпламатыя лічыла неабходным дабіцца, каб у будучых пагадненнях былі ў роўнай ступені зафіксаваны міжнародныя гарантыі як для заходніх, так і для ўсходніх граніц Германіі. Для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дасягнення гэтай мэты ўрад У. Грабскага асноўную стаўку рабіў на саюз з Францыяй.
У сакавіку 1925 г. А. Скшыньскі накіраваўся ў Парыж, каб атрымаць ад французскага ўрада падтрымку польскай пазіцыі адносна будучага дагавора. Першапачаткова пазіцыя Францыі была спрыяльнай для Польшчы. Але ў далейшым урад Эрыо вымушаны быў кансалідавацца з пазіцыяй Вялікабрытаніі. Брытанская ж пазіцыя зводзілася да формулы, якую выразна сфармуляваў у лісце паслу ў Берліне ад 18 сакавіка міністр замежных спраў О. Чэмберлен: «Мы не возьмем на сябе ніякіх абавязательстваў адносна якіх бы та не было граніц, акрамя граніц паміж Германіяй з аднаго боку і Францыяй і Бельгіяй з другога» [4, с. 182]. Калі 6 ліпені А. Скшыньскі ў Парыжы сустрэўся з французскім калегай А. Брыянам, той заявіў, што Францыя не адмаўляецца ад абавязцельстваў аказваць ваенную дапамогу сваім усходнееўрапейскім саюзнікам, але не прыняў польскія патрабаванні адносна Гарантыйнага пакта. 7 ліпеня ў гутарцы з польскім паслом у Лондане К. Скірмунтам О Чэмберлен заявіў, што англійскі ўрад дзеля таго, каб зрабіць немагчымым заключэнне савецка-германскага палітычнага дагавора, гатовы задаволіць тэрытарыяльныя прытэнзіі Германіі да Польшчы з адначасовай кампенсацыяй апошняй у якім-небудзь іншым месцы [5, с. 64]. У канцы лета 1925 г. стала відавочна, што намаганні Польшчы з дапамогай Францыі дабіцца ўліку яе пазіцыі ў Гарантыйным дагаворы не прынеслі станоўчага выніку.
Савецкі Саюз ва ўмовах збліжэння Германіі з Захадам галоўным для сябе лічыў захаванне рапальскай палітыкі. Намаганні ў гэтым накірунку Масква стала прадпрымаць яшчэ ў 1924 г. перш за ўсѐ ў сувязі з афіцыйнай заявай германскага ўрада аб намеры дабівацца ўступлення ў Лігу нацый. 17 кастрычніка 1924 г. намеснік наркама замежных спраў СССР М. Літвінаў паведаміў германскаму пасланаму ў справах у Маскве аб гатоўнасці Савецкага Саюза заключыць з Германіяй дагавор, па якім ні адзін з бакоў не меў бы права ўваходзіць у Лігу нацый без згоды другога [6, с. 490]. Германскі ўрад заявіў аб гатоўнасці пачаць палітычныя перамовы. Пры гэтым савецкае кіраўніцтва зыходзіла з таго, што рапальская палітыка ў многім трымаецца на антыпольскім грунце. 4 снежня ў гутарцы з германскім паслом у Маскве член калегіі НКЗС СССР В. Коп заўважыў, што —дасягненне паразумення з Германіяй па польскаму пытанню з'яўляецца —вельмі пажаданным і прапанаваў арганізаваць сумеснае выступленне супраць Польшчы, калі Германія не адмаўляецца ад сваіх тэрытарыяльных прытэнзій. У. Брокдорф-Ранцау адказаў, што Германія не можа адмовіцца ад сваіх тэрытарыяльных патрабаванняў, але ў цяперашні час абсалютна немагчыма дабіцца

гэтага сілаю. Германскі міністр замежных спраў Г. Штрэзаман падтрымаў прапанову аб абмеркаванні польскага пытання. Ён даручыў германскаму паслу сустрэцца з Г. Чычэрыным і давесці да яго германскую пазіцыю, якая зводзілася да аказання Германіяй і Расіяй нажыму на Польшчу з мэтай адцяснення яе да этнічных граніц. У ходзе гутаркі савецкі наркам у прынцыпе не адхіліў гэтай прапановы, але заявіў, што СССР шукае працягу супрацоўніцтва з Германіяй па ўсіх палітычных пытаннях [5, с. 64, 65].
Палітбюро ЦК УКП (б) 24 снежня 1924 г. абмеркавала пытанне аб перамовах з Германіяй і падтрымала пазіцыю Г. Чычэрэна, якая не адмаўляла сумеснага з Германіяй перагляду польскай грыніцы пры ўмове пагаднення па іншых пытаннях савецка-германскіх адносін, перш за ўсѐ, аб адносінах да Лігі нацый [7, с. 57]. У тыя ж дні СССР рыхтаваўся пачаць палітычныя перамовы і з Польшчай. У рашэнні Палітбюро ад 18 снежня гаварылася, што пры іх вядзенні не варта адмаўляцца ад прынцыпу выпраўлення граніц з Польшчай [8, с. 10]. Рашэнні Палітбюро ад 24 снежня былі пакладзеныя ў аснову савецкай прапановы аб заключэнні палітычнага дагавора, зробленай Германіі 25 снежня. Акцэнт у ѐй рабіўся на неабходнасці ўключэння ў будучае пагадненне пункта, паводле якога СССР і Германія абавязваюцца каардынаваць свае дзеянні па пытанні аб уступленні ў Лігу нацый [9, с. 389]. Пры гэтым было відавочна, што пытанні ўступлення Германіі ў Лігу нацый і падпісання Гарантыйнага пакта непарыўна звязаны паміж сабою.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Савецка-германскія перамовы рухаліся з вялікім цяжкасцямі. Толькі 25 красавіка 1925 г. быў прадстаўлены афіцыйны германскі адказ на савецкія прапановы ад 25 снежня 1924 г. Фактычна яны былі адхілены [10, с. 249–254]. Для аказання ціску на Германію савецкае кіраўніцтва прыбегла да дэманстрацыі збліжэння з Польшчай. Тым больш, што і польскі бок быў гатовы да паляпшэння адносін з СССР. Польскі ўрад разлічваў тым самым аказаць ціск на заходнія дзяржавы, каб прымусіць іх улічыць польскія інтарэсы пры падрыхтоўцы Гарантыйнага пакта. Германія практычна не хавала намеру перагледзець грніцы на ўсходе. 18 мая 1925 г. Г. Штрэзаман у прамове ў рэйхстазе падкрэсліў, што польска-германская граніца супярэчыць прынцыпу самавызначэння народаў, але Германія не будзе дабівацца яе перагляду гвалтоўным шляхам [11]. Абмеркаванне пытання аб змяненні граніц Польшчы з раздражненнем і заклапочанасцю ўспрымалася ў Варшаве. Прэмʻер-міністр У. Грабскі заявіў у сейме 29 красавіка, што Польшча добраахвотна не пагадзіцца на змены сваіх граніц, чаго дабіваецца Германія [12].

Яшчэ адзін момант, які штурхаў Польшчу да паляпшэння адносін з СССР – імкненне тым самым выклікаць дадатковыя супярэчнасці ў савецка-германскіх адносінах. Польская дыпламатыя разлічвала, што Г. Штрэзаман не здолее сумясціць Гарантыйны пакт і Рапальскі дагавор, у выніку чаго разамкнуцца —геапалітычныя цiскі , у якія заціснулі Польшчу Расія і Германія. У мемарандуме МЗС Польшчы ад 27 ліпеня 1925 г. ставілася задача супрацьдзейнічаць савецка-германскаму збліжэнню шляхам выкарыстання любых разнагалоссяў у іх адносінах і —забеспячэння якога б то не было ўдзелу ў пытанні выбару Германіяй пазіцыі —за ці —супраць Рапальскага дагавора [5, с. 64]. Такім чынам, меўся фундамент для пацяплення ў польска-савецкіх адносінах на фоне падрыхтоўкі Гарантыйнага пакта. Аднак польска-савецкія перамовы аб заключэнні дагавора аб ненападзе, якія адбываліся з пачатку 1925 г., закончыліся няўдачай у канцы сакавіка. Польскі бок настойваў на заключэнні СССР калектыўнага дагавора з Польшчай, балтыйскімі краінамі і Румыніяй. Масква бачыла ў гэтых планах Польшчы імкненне ўмацаваць яе ўплыў у рэгіѐне, у прыватнасці, стварыць польска-балтыйскі блок [13].

Тым не менш, савецкае кіраўніцтва не адмаўлялася ад палітыкі паляпшэння адносін з Польшчай. Польскі ўрад у сувязі з няўдачамі ў адстойванні сваѐй пазіцыі адносна Гарантыйнага пакта, таксама захаваў зацікаўленасць у збліжэнні з Савецкім Саюзам. 12 ліпеня 1925 г. у Берліне адбылася сустрэча К. Радака з польскім палітыкам Х. Таненбаўмам. Яны абодва не займалі ў той момант афіцыйных дзяржаўных пасад, таму сустрэча насіла неафіцыйны характар. К. Радак заявіў, што далучэнне Германіі да Гарантыйнага пакта павінна

змяніць адносіны Расіі і Германіі. Наступствам гэтых змен будзе польска-савецкае збліжэнне. Пры гэтым ѐн паведаміў, што германскае МЗС спрабавала весці з савецкім бокам гутарку на тэму падзелу Польшчы, але савецкія прадстаўнікі занялі на перамовах адмоўную пазіцыю. К. Радак назваў тры пункты, вырашэнне якіх павінна было спрыяць паляпшэнню польскасавецкіх адносін: 1) адмова Польшчы ад фінансавых прытэнзій да савецкага боку; 2) заключэнне польска-савецкага пакта аб ненападзе; 3) легалізацыя камуністычнай партыі ў Польшчы. У адказ Х. Таненбаўм настойваў на выкананні СССР фінансавых абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору і заключэнні ім адначасова дагавораў аб ненападзе з Польшчай і балтыйскімі краінамі [5, с. 65].

Захоўваць перагаворны працэс з Польшчай кіраўніцтва СССР у многім прымушула сітуацыя, якая складвалася ў савецка-германскіх адносінах. Прычым асаблівую трывогу ў Маскве выклікала магчымасць, што ў праектуемым Гарантыйным пакце Германія прадаставіць дадатковыя гарантыі польскіх граніц. 15 красавіка адбылася гутарка германскага міністра замежных спраў з савецкім паўпрадам у Берліне М. Красцінскім, падчас якой германскі бок выказаў запэўненне, што будучы дагавор не накіраваны супраць СССР. Г. Штрэзаман адзначыў, што Германія пакідае за сабой свабоду рук у адносінах ўсходняй граніцы і будзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

імкнуцца да яе рэвізіі ўсімі мірнымі сродкамі. У адказ на заўвагу М. Красцінскага, што Германія аб'ядноўваецца з Антантай супраць Расіі, Г. Штрэзаман запэўніў, што германскі ўрад ні разу не меў намеру аб'яднацца з Польшчай супраць Расіі [14, s. 512, 513]. Канцлер Г. Лютар 22 красавіка ў гутарцы з савецкім паўпрадам таксама спрабаваў пераканаць яго, што ўступленне Германіі ў Лігу нацый і яе ўдзел у падпісанні Гарантыйнага пакта не азначае канец рапальскай палітыкі, бо ―збліжэнне паміж Германіяй і Расіяй, эканамічнае і палітычнае, дыктуецца аб'ектыўным станам рэчаў  [15, с. 428]. Але заявы германскага ўрада аб гатоўнасці працягваць супрацоўніцтва з СССР не задаволілі савецкае кіраўніцтва. 2 чэрвеня савецкі наркам замежных спраў накіраваў мемарандум германскаму міністру замежных спраў, у якім адзначаў, што ўступленне Германіі ў Лігу нацый без СССР азначала б яе далучэнне да ―варожай нам групоўкі. Германія, нараўне з іншымі членамі Лігі нацый, павінна была б падтрымаць Польшчу, Фінляндыю і г. д. у выпадку канфлікту з савецкімі рэспублікамі. Гэта канец Рапальскай сістэмы  [9, с. 237].

Паколькі ў аснове савецка-германскага супрацоўніцтва ляжала агульнае імкненне ―адціснуць Польшчы да яе этнічным межаў , ва ўмовах хуткага збліжэння Германіі з Захадам яшчэ больш узрастала зацікаўленасць СССР у захаванні напружанасці ў польска-германскіх адносінах. Яе наяўнасць з'яўлялася адноснай гарантыяй таго, што Германія не пойдзе на разрыў з Расіяй. Таму савецкая дыпламатыя прыкладала вялікія намаганні, каб перашкаджаць любым пазітыўным зменам у адносінах паміж Варшавай і Берлінам. Паказальны ў гэтым плане ліст П. Войкова ў Маскву ад 22 мая, у якім ѐн з задавальненнем канстатаваў, што гандлѐвыя перамовы паміж Германіяй і Польшчай ―знаходзяцца на мѐртвай кропцы  [2, л. 205]. У той жа час Масква спрабавала аказаць ціск на Берлін, пагражаючы супрацоўніцтвам з Польшчай. 13 чэрвеня ў гутарцы з Г. Штрэзаманам М. Літвінаў даў зразумець, што ў сітуацыі, якая склалася ў савецка-германскіх адносінах у сувязі з падрыхтоўкай Гарантыйнага пакта, СССР можа пайсці на збліжэнне з Польшчай і Францыяй [16, s. 95]. У канцы лета 1925 г. германскі ўрад прыйшоў да высновы, што ў польска-савецкіх адносінах назіраецца пацяпленне, сведчаннем чаго з'яўляецца, у прыватнасці, заключэнне дагавора аб вырашэнні пагранічных канфліктаў. Г. Штрэзаман пасля гэтага загадаў германскай дэлегацыі на гандлѐвых перамовах у Маскве, якая планавала ад'езд у Германію, заставацца на месцы, і, ―улічваючы палітычныя меркаванні, заключыць з рускімі які б то ні было дагавор . Германія адмовілася ад тактыкі зацягвання перамоў з СССР [17, с. 137].

Істотную ролю ў развіцці міжнароднапалітычных падзей у Цэнтральна-Усходняй Еўропе адыгралі візіты Г. Чычэрына ў Варшаву і Берлін у канцы верасня – катрычніку 1925 г. Польскі ўрад актыўна дабіваўся прыезду савецкага наркама ў Варшаву. Дэманстрацыя збліжэння з СССР патрэбна была Польшчы, каб умацаваць свае міжнародныя пазіцыі, аказаць

ціск на краіны Захаду і прымусіць іх больш лічыцца з польскімі інтарэсамі [18]. Са свайго боку, савецкае кіраўніцтва разлічвала з дапамогай гэтага візіта аказаць ціск на Германію, каб паскорыць перамовы аб заключэнні гандлѐвага і палітычнага дагавораў. Г. Дзірксан у сваіх мемуарах пісаў, што прыпынак Чычэрына ў Варшаве па дарозе ў Берлін быў жэстам, які нагадваў шантаж [19, с. 87]. Трэба прызнаць, што разлікі савецкага кіраўніцтва апраўдаліся. Калі ўслед за Варшавай, Г. Чычэрын прыбыў у Берлін, Г. Штрэзаман у гутарцы з ім заявіў аб гатовасці Германіі падпісаць гандлѐвы дагавор з СССР. 7 кастрычніка Г. Чычэрына прыняў прэзідэнт П. Гіндэнбург і паведаміў, што ѐн упаўнаважыў Брокдорф-Ранцау падпісаць гандлѐвы дагавор з СССР [20].

У час перамоў у Берліне Г. Чычэрын у чарговы раз выказаў занепакоенасць, што падпісанне Германіяй Гарантыйнага пакта прывядзе да якога-небудзь, хай нават ускоснага, пацвярджэння германа-польскай граніцы. На гэта германскі міністр замежных спраў адказаў, што Германія ніколі не пойдзе добраахвотна на прадастаўленне гарантый Польшчы. 10 кастрычніка Г. Штрэзаман прадставіў Г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Чычэрыну мемарандум, у якім заяўлялася, у прыватнасці, што аб гарантыі ўсходняй мяжы Германіі ў праекце Гарантыйнага пакта няма і мовы [14, s. 515, 512]. Савецкае кіраўніцтва дарма апасалася надання гарантый граніцам Польшчы з боку Германіі па Гарантыйным пакце. Г. Штрэзаман у лісце былому кронпрынцу ад 9 верасня 1925 г. у якасці найбольш важных задач знешняй палітыкі Германіі назваў —вяртанне Данцыга, польскага калідора і карэктыроўку мяжы ў Верхняй Сілезіі [14, s. 553]. Такім чынам, германскія планы, нацэленыя на рэвізію германа-польскай мяжы, не змяніліся, і, такім чынам, засталася аснова для рапальскага курсу. Як пісаў у сваіх мемуарах Г. Дзірксан, у аснове руска-германскай дружбы —ляжала агульная нелюбоў да свайго агульнага суседа – Польшчы [19, с. 37].

12 кастрычніка 1925 г. быў падпісаны Маскоўскі гандлѐвы дагавор паміж СССР і Германіяй. У Лакарна ў гэтыя ж дні Германія змагла дамагчыся для сябе адмысловых умоў выканання арт. 16 Статуту Лігі нацый. Яны пакідалі ѐй свабоду рук у справе ўдзелу ў санкцыях, якія маглі б быць ужытыя гэтай арганізацыяй у дачыненні да СССР. Тым самым Г. Штрэзаману ўдалося сумясціць Рапала і Лакарна. Берлінскі савецка-германскі дагавор аб нейтралітэце ў поўнай меры прадэманстраваў магчымасць сумяшчэння гэтых двух ліній у германскай палітыцы, што было неабходна для паступовай мірнай рэвізіі Версальскага дагавора, да чаго імкнулася дыпламатыя Г. Штрэзамана. Савецкае кіраўніцтва ў той час таксама захоўвала курс на разбурэнне Версальскай сістэмы, у якой, па яго меркаванню, Лакарна мала што змяніла. І. Сталін, выступаючы ў снежні 1925 г. на 14 з'ездзе УКП (б), заявіў, што Лакарнскія пагадненні не сцерлі супярэчнасці паміж пераможанымі і пераможцамі, а толькі абвастрылі іх. Далей ѐн адзначыў, што Лакарна з'яўляецца працягам Версалю і нацэлена на захаванне статут-кво, створанага пераможцамі [21, с. 13–14]. Тым самым захавалася база для далейшага працягу рапальскай палітыкі.

Такім чынам, падрыхтоўка Гарынтыйнага пакта аказала істотны ўплыў на знешнюю палітыку вядучых краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Яна падштурхнула працэс польска-савецкага збліжэння, які пачаўся ў 1924 г. Але карэнных змен да лепшага ў польска-савецкіх адносінах не адбылося. Звязана гэта ў многім з тым, што абодва бакі разглядалі паляпшэнне адносін паміж сабой не столькі як самамэту, а больш як тактычны ход, які павінен быў садзейнічаць вырашэнню знешнепалітычных задач на іншых напрамках. Перамовы аб Гарантыйным пакце парадзілі шэраг новых праблем у савецка-германскіх адносінах, узнікла пэўная пагроза для рапальскай палітыкі. Але захаванне агульнай антыверсальскай і антыпольскай палітыкі дзвюма дзяржавамі дазволіла ім справіцца з цяжкасцямі ў двухбаковых адносінах і захаваць цеснае супрацоўніцтва. У 1925 г. адбылося рэзкае абвастрэнне польска-германскіх адносін. Ва ўмовах падрыхтоўкі Гарантыйнага пакта Германія адчула, што



Вялікабрытанія і Францыя ў прынцыпе не выключаюць магчымасці перагляду польска-германскай граніцы мірнымі сродкамі. Гэта прывяло да актывізацыі германскай палітыкі ў гэтым накірунку, і Германія ўжо не хавала свойго імкнення перагледзіць свае ўсходнія граніцы, абапіраючыся на падтрымку СССР і добразычлівае стаўленне заходніх краін. Польскай дыпламатыі не ўдалося дабіцца ні перагляду на сваю карысць палажэнняў Гарантыйнага пакта, ні краху рапальскай палітыкі ў адпаведнасці са спадзяваннямі на немагчымасць для Германіі сумяшчаць Гарантыйны і Рапальскі дагаворы. У той жа час аслабла дзейснасць польска - французскага саюза.

**Крыніцы і літаратура**

1. Трухнов, Г. М. Поучительные уроки истории. Три советско-германских договора. 1922–1926 / Г. М. Трухнов. – Мн. : Изд. БГУ, 1979. – 183 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2. Архив внешней политики Российской Федерации. – Ф. 04. Оп. 32. П. 217. Д. 52667.
3. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej 1918–1939. W. 2 t. T. 1. – Warszawa: Inst. Wyd. Pax., 1989.
4. Турок, В. Локарно (5–16 октября 1925 г.) / В. Турок. – М. : Госполитиздат, 1949. – 321 с.
5. Бобенко, О. В. Польско-советские отношения в 1924–1928 гг.: От противостояния к сотрудничеству / О. В. Бобенко. – М. : [Б. и.], 2007. – 223 с.
6. Документы внешней политики СССР. В 24 т. Т. 7. . – М. : Госполитиздат, 1963. – 740 с.
7. Политбюро ЦК РКП (б) – ВКП (б) и Коминтерн: 1919–1943 гг. Документы. – М. : «Российская политическая энциклопедия», 2004. – 960 с.
8. Материалы особой папки Политбюро ЦК РКП (б) – ВКП (б) по вопросу советско-польских отношений. 1923–1945. – М. : Институт славяноведения и балканистики, 1997. – 144 с.
9. Советско-германские отношения. 1922–1925 гг. Документы и материалы. В 2 ч. Ч. 2. – М. : Издательство политической литературы, 1977. – 408 с.
10. Документы внешней политики СССР. В 24 т. Т. 8. . – М. : Госполитиздат, 1963. – 862 с.
11. Известия. 1925. 20 мая. № 113. (2446).
12. Известия. 1925. 1 мая. № 98. (2431).
13. Мязга, М. М. Польска-савецкія перамовы аб дагавору аб ненападзе ў 1924–1926 гг. // Веснік БДУ. Серыя 3 – Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1996. – № 1. – С. 47–51.
14. Stresemann, G. Vermachtnis / G. Stresemann. In 3 b. B. 2. – Berlin: Ullstein Von Henri Bernhard, 1932. – 611 s.
15. История дипломатии / Под редакцией А. А. Громыко. В 5 т. Т. 3. – М. : Политиздат, 1965. – 831 с.
16. Kaminski, M. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej. 1918–1939 / M. Kaminski. – Warszawa: Mlodziezowe Agencja Wydawnicza, 1987. – 120 s.
17. Никонова, С. В. Очерки европейской политики Германии в 1924–1929 годах / С. В. Никонова. – М. : Наука, 1977. – 373 с.
18. Мязга, М. М. Візіт наркама замежных спраў СССР Г. В. Чычэрына ў Варшаву восенню 1925 г. / М. М. Мязга // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2015. – № 1 (88) – С. 37–41.
19. Дирксен, Г. Москва, Токио, Лондон. Двадцать лет германской внешней политики / Г. Дирксен. – М. : «ОЛМА-ПРЕСС», 2001. – 446 с.
20. Известия. 1925. 9 октября. № 231. (2564).
21. Четырнадцатый съезд ВКП (б). Стенографический отчет. – М. – Л. : Госиздат, 1926. – 789 с.
**Mikalai Miazga. Changes of international situation in Central-Eastern Europe caused by the preparation of Rhineland Guarantee Pact.** The article discusses the international situation in Central

Eastern Europe during the preparation of Rhineland Guarantee Pact. It is established how preparation of the pact affected relationship among USSR, Germany, and Poland, and how it impacted their foreign policy.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ